# Вызначальны этап

**Пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры, прысвечанае вынікам 2023 года і задачам на 2024-ы, адбылося ў Нацыянальнай бібліятэцы. Удзельнікамі сталі амаль 400 спецыялістаў са сталіцы і рэгіёнаў. Так, адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне работнікаў сферы па рэзультатах мінулага года. Да мерапрыемства прымеркавалі выстаўку дасягненняў рэгіёнаў.**

Міністр культуры Анатоль Маркевіч адзначыў поспехі ў развіцці сферы ў 2023 годзе і нагадаў аб распараджэнні Кіраўніка дзяржавы зрабіць беларускі прадукт самым лепшым і запатрабаваным на ўнутраным і на знешнім рынках. Ён звярнуў увагу на абнаўленне кадравага саставу кіраўнікоў, укараненне сістэмы настаўніцтва для нованазначаных спецыялістаў, распрацоўку структуры эфектыўнай сеткі клубных, музейных і бібліятэчных устаноў па ўсёй краіне. «Наша задача — стварыць аптымальную мадэль работы арганізацый галіны і пазбавіцца ад незапатрабаваных звёнаў», — падкрэсліў Анатоль Мечыслававіч.

Сярод асноўных праблем, на думку міністра культуры, — няўменне кіраўнікоў арганізацый прагназаваць неабходнасць у кадрах, а таксама недастатковая матываванасць выпускнікоў. Для змянення становішча Анатоль Маркевіч прапанаваў перападрыхтоўку супрацоўнікаў, якія не маюць спецыяльнай адукацыі, перагляд падыходаў да прафарыентацыйнай работы, павышэнне заработнай платы.

Шмат увагі падчас пасяджэння калегіі было нададзена святкаванню 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта вызначальная падзея для культурнага і ідэалагічнага жыцця краіны, заявіў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар Петрышэнка:



*Фота з сайта kultura.by*

*Намеснік кіраўніка адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар Луцкі, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар Петрышэнка і міністр культуры Анатоль Маркевіч.*

«Рэалізацыя праектаў на гэтую тэму, уключэнне ў жыццё ўсіх слаёў насельніцтва павінна ажыццяўляцца дзяржаўнымі арганізацыямі культуры ўсіх узроўняў. Усе ўстановы абавязаны працаваць на гэтую тэматыку: музеі, тэатры, бібліятэкі, клубы, вядучыя калектывы... Змест іх работы павінен быць накіраваны на раскрыццё гэтай падзеі і яе значнасці для нашай краіны».

Адной з найважнейшых ініцыятыў года стане рэспубліканская акцыя «Культурная карта». Шэсць вядучых тэатраў і Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» прадэманструюць свае найлепшыя праекты ў 118 раёнах Беларусі.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**